**<u>ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАЙ ПІСЬМЕННАСЦІ</u>**

**ХРАНАЛОГІЯ СВЯТА**





# ГАРАДОК

**2023**

***С великих возвращаясь городов,***
***Я наслаждаюсь ласковостью улиц,***
***Мелодией знакомых голосов,***
***Небесным светом лиц родных любуюсь...***
***Милейший, лучезарно-тихий город –***
***Мой Городок!***
***О, как ты сердцу дорог!***

***Н. Советная***

У 2023 годзе юбілейны ХХХ Дзень беларускага пісьменства будзе прымаць паўночны рэгіён нашай краіны – Віцебская вобласць. Свята адбудзецца ў раённым цэнтры Гарадок, на радзіме Канстанціна Вераніцына – аўтара вядомай сатырычна-гумарыстычнай паэмы «Тарас на Парнасе».

Невялікі Гарадок, які раскінуўся на берагах ракі Гараджанка і возера Лугавое, прыцягвае ўвагу сваімі яркімі старонкамі гісторыі, старажытнымі традыцыямі і гістарычнымі славутасцямі.

Гісторыя Гарадка, які ўзнік на месцы старажытнага ўмацаванага паселішча, сыходзіць сваімі каранямі ў XII стагоддзе. Першае пісьмовае згадванне ў летапісах аб гэтым невялікім селішчы адносіцца да 1128 года ў сувязі з ваенным паходам кіеўскага князя Мсціслава Уладзіміравіча на землі Полацка. Узгадваецца Гарадок і ў крыніцах другой паловы XIII стагоддзя, як «Гарадок каля Полацка», дзе адбылася бітва паміж літоўскімі войскамі і палачанамі.

У сярэднія вякі гарадоцкія землі ўваходзілі ў склад Полацкага княства, а з XIV стагоддзя – Віцебскага ваяводства Вялікага Княства Літоўскага. Памежнае становішча паселішча абумовіла знаходжанне тут магутных умацаванняў, і ў канцы XVI стагоддзя ў Гарадку быў пабудаваны бастыённы замак з магутнымі абарончымі валамі і пяццю вежамі для абароны паўночных рубяжоў. Умацаванні знаходзіліся па абодва бакі ракі Гараджанкі. На багністым лузе левага берага быў насыпаны земляны вал у форме чатырохкутніка. На ўзвышэнні правага берага стаяў каменны замак, узведзены як абарончы бастыён. Замак акружаў запоўнены вадой роў 16 метраў шырынёй і 3,3 метра глыбінёй. Сцены замка стаялі на высокіх земляных валах. Праз кожныя 20-30 метраў знаходзіліся бастыёны для стральбы з гармат. Падчас ваенных дзеянняў паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Рускай дзяржавай замак неаднаразова разбураўся, затым зноў адбудоўваўся. Канчаткова замак прыйшоў у заняпад у XVII стагоддзі. Верагодна, канчаткова быў разбураны падчас Паўночнай вайны на пачатку XVIII стагоддзі. Яго руіны і сёння можна ўбачыць у цэнтры Гарадка. Часткова захаваліся абарончыя равы і фрагменты бастыёнаў. Замчышча неаднаразова рабілася аб’ектам археалагічных раскопак, з некаторымі знойдзенымі артэфактамі можна пазнаёміцца ў краязнаўчым музеі Гарадка.

У 1772 годзе пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай і далучэння Гарадка да Расійскай імперыі мястэчка атрымлівае статус горада, а праз дзевяць гадоў, у 1781, і ўласны герб з выявай ільва на залатым полі – сімвалам сілы і адвагі. У 2006 годзе гістарычны герб, а ў 2011-м – сцяг, былі прызнаны афіцыйнай сімволікай горада.

Гарадок з’яўляўся цэнтрам павета ў Полацкай, Беларускай, а потым у Віцебскай губернях. Мястэчка расло ўздоўж гасцінца Віцебск – Санкт-Пецярбург. У пачатку ХХ стагоддзя праз Гарадок прайшла чыгунка. Да таго часу гэта было невялікае прамысловае мястэчка, дзе працавалі 14 заводаў, фабрыка, паравы млын, больш за 200 гандлёвых і рамесных устаноў, вучылішча, лякарня і тры аптэкі, бібліятэка, дзве царквы, 10 сінагог. Тройчы

за год у Гарадку ладзіліся кірмашы. Як яны праходзілі, можна даведацца ў краязнаўчым музеі, дзе гарадоцкім кірмашам прысвечана асобная экспазіцыя.

















№ 2. ВЫДАВЬНЕ „НАШАЕ ХАТЫ“ № 2.

# ТАРАС на ПАРНАСЕ

Новае перагледжанае выданьне.

ВІЛЬНЯ.

Друкарня М. Кухты, Дворцовая, д. № 1.

1909.


ГАРАДОК
1777







Спрадвеку Гарадок быў рамесніцкім, а затым – прамысловым мястэчкам. Больш за ўсё гарадакчане атрымалі поспех у ганчарным рамястве. Найбольшае развіццё гэты промысел атрымаў у XIX – першай палове XX стагоддзя, калі ў мястэчку сталі стварацца ганчарныя арцелі, пазней пераўтвораныя ў цэхі, якія мясцовыя жыхары называлі проста «ганчаркай». Гарадоцкая кераміка адрознівалася прастатой і пластычнасцю формаў і светлым тэракотавым колерам з адценнямі фіялетавага і карычневага. У асноўным майстры выраблялі керамічныя вырабы гаспадарчага прызначэння – гаршкі, збаны, глякі, гладышы, міскі, якія сёння, нажаль, выйшлі з ужытку на сучаснай кухні. У прамысловых маштабах гарадоцкая кераміка больш не вырабляецца, але ганчарнае кола круціцца ў мясцовым доме рамёстваў. Характэрна, што старое рамяство ў сучасным Гарадку адрадзілі ганчары-жанчыны.

Славіцца Гарадок і сваёй нематэрыяльнай культурай. Так, мясцовае ткацтва «Кісея» ўнесена ў дзяржаўны спіс нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны краіны. А паглядзець узоры абрусаў і ручнікоў, выкананых у мясцовай манеры, можна ў раённым краязнаўчым музеі і Гарадоцкім доме рамёстваў.

Вядомы Гарадок і сваім абрадам «Пахаванне дзеда», які праводзіцца ў першы дзень Масленіцы і сімвалізуе сабой праводзіны зімы. Так, калі ў іншых частках Беларусі спальваецца пудзіла, то ў Гарадку адбываецца «пахаванне» лялькі ў натуральную велічыню. Так тут прынята сустракаць пачатак вясны.

Гарадоцкія майстры таксама адрадзілі батлейку з сезоннымі спектаклямі ў рэпертуары. Батлеечная шафа, лялечныя персанажы і дэкарацыі ствараліся згодна з мясцовым фальклорным традыцыям.

Сярод архітэктурных славутасцяў горада неабходна назваць будынкі паштовых станцый сярэдзіны XIX стагоддзя, якія захаваліся ў Гарадку і яго наваколлях яшчэ з часоў Расійскай імперыі. З таго часу таксама захаваўся вадзяны млын і застаўны дом. Акрамя таго, Гарадок можа пахваліцца захаванай гістарычнай гарадской забудовай канца XIX – пачатку XX стагоддзя: гандлёвымі і жылымі дамамі.

Візітнай карткай горада з’яўляецца Свята-Троіцкая царква, перабудаваная ў канцы XX стагоддзя з будынка былой царкоўна-прыходскай школы. У лік рэлігійных славутасцяў горада ўваходзіць і Благавешчанскі касцёл, таксама пабудаваны ў канцы XX стагоддзя.

Ёсць у горадзе і камяні-валуны, устаноўленыя ў памяць беларускага паэта Канстанціна Вераніцына – аўтара знакамітага «Тараса на Парнасе». Верагоднае аўтарства самага папулярнага ў XIX стагоддзі беларускага твора, які доўгі час насіў статус ананімнага, прыпісваюць ураджэнцу тутэйшых мясцін Канстанціну Вераніцыну, аднаму з заснавальнікаў новай беларускай літаратуры. І хаця нарадзіўся ён у Астраўлянах, паэму ў 1855 годзе пісаў у Гарадку, дзе вучыўся ў прыходскім вучылішчы.

Калі вы яшчэ не чыталі гэтую сатырычна-гумарыстычную паэму, то варта сумясціць яе прачытанне з паездкай у Гарадок на свята народнай творчасці, беларускай паэзіі і фальклору «Гарадоцкі Парнас». На штогадовым

мерапрыемстве з нагоды аўтара і яго твора ў Гарадку збіраюцца аматары літаратуры і паэзіі. Для гасцей арганізуюць аўтобусную экскурсію па «вераніцынскіх» месцах і велапрабег для жадаючых «Сцежкамі Тараса», працягласцю каля 40 кіламетраў.

Галоўная мясцовая прыродная славутасць – урочышча «Вараб’ёвы горы» на ўскраіне Гарадка. Тут можна пракаціцца па гарадоцкай лыжаролернай трасе, наведаць рэзідэнцыю Снягуркі на востраве паміж азёрамі Лугавое і Арэхавае і проста адпачыць на ўлонні прыгожай прыроды. Сасновае паветра, узгорыстая мясцовасць і азёрная празрыстая вада – прывабны варыянт летняга адпачынку.

Ураджэнцамі Гарадокшчыны з’яўляюцца такія вядомыя на беларускай зямлі і за яе межамі людзі, як пісьменнік Г. Шмань, дырыжор, прафесар Ленінградскай кансерваторыі, заслужаны артыст Літоўскай ССР З. Машарскі, дзяржаўны і палітычны дзеяч, літаратар Бэр Аршанскі, беларуская лыжніца і біятланістка Анастасія Дубарэзава.